Газета для вас

ІВАЦЭВІЧЫ–БАРАНАВІЧЫ–БЯРОЗА–ПРУЖАНЫ

№ 21(232) 26 мая – 1 чэрвеня 2000 г. | ГРАМАДСКАЕ НЕЗАЛЕЖНАЕ ВЫДАННЕ, ВЫХОДЗІЦЬ СА СТУДЗЕНЯ 1997 г. | Цана — 50 руб.



● *1 ЧЭРВЕНЯ — МІЖНАРОДНЫ ДЗЕНЬ АБАРОНЫ ДЗЯЦЕЙ*







А ДЗЕЦІ ХВАРЭЮЦЬ

Абараняць нашых дзяцей сапраўды ёсць ад чаго: ад траўматызму на дарогах, ад забруджанага радыяцыяй паветра, ад раўнадушша чыноўнікаў... Як і прагназавалі спецыялісты, менавіта цераз дзесяць год пасля чарнобыльскага выбуху рэзка абвастрылася сітуацыя з захворваннямі на шчытападобную залозу ў дзяцей. У тым ліку і ў нашым рэгіёне.

Як паведаміла нашаму выданню Тамара Чыж, загадчык санітарна-гігіенічнага аддзела Івацэвіцкага РЦГіЭ, дадзеныя па злаякасных пухлінах шчытападобнай залозы, па хваробах на гэты орган сведчаць аб тым, што сітуацыя — складаная.

Так, у Івацэвічах і раёне ў 1993 годзе толькі адно дзіця было зафіксавана са злаякаснай пухлінай залозы, зараз — пяць. У 1993 годзе пакутавалі ад хваробаў залозы дзесяць дзяцей, зараз — 81, у тры разы павялічыліся захворванні крыві ў дзяцей (1993 — 27 дзяцей, 1999 — 82). Па словах Тамары Пятроўны, не толькі вынікі чарнобыльскага выбуху, але і экалагічныя праблемы, агульнае збядненне насельніцтва, перагружаныя школьныя праграмы спрыяюць распаўсюджванню захворванняў.

Падобная цяжкая сітуацыя склалася і ў Бярозаўскім, Пружанскім, Баранавіцкім раёнах.

Паважаныя дарослыя! Жывем мы ў складаных умовах, але ж няма нічога важней і даражэй за дзяцей, іх здароўе. Зрабіце ўсё, каб кожнае дзіця адчувала ваш клопат!

Аляксандр ГОРБАЧ.

АМЕРЫКАНЦЫ ПРЫЕХАЛІ ВУЧЫЦЦА

БЯРОЗА. На мінулым тыдні завод мінералаватных вырабаў наведала амерыканская дэлегацыя, у якую ўваходзілі і прадстаўнікі Інстытута газавых тэхналогій (IGT) і амерыканскага завода па вытворчасці мінваты. На Бярозаўскім ЗМВВ працуе канвектар, які распрацаваў навуковы супрацоўнік Кіеўскага інстытута газа Уладзімір Алабін, і якім ужо не адзін год цікавяцца амерыканскія вытворцы. Практычную дзейнасць канвектара яны і прыязджалі паглядзець. Вытворчасць мінваты ў Бярозе зацікавіла гасцей са Злучаных Штатаў.

Сяржук РУСЕЦКІ.

КОЗЫ — БОЛЬШ ВЫГАДНЫЯ

ІВАЦЭВІЧЫ. У гэтым пераконваешся, калі знаёмішся са зводкамі работы жывёлагадоўлі гаспадарак раёна. За чатыры месяцы гэтага годы надоена ад кожнай каровы па 576 кілаграмаў малака, на 61 кілаграм менш, чым летась. Дзённы надой ад каровы ў калгасах "Косава", "40 год Кастрычніка", "Быценскі", "Іскра", "Савецкая Беларусь", "Зара" складае менш трох літраў. Ці не пара такіх кароў замяніць козамі? Значна танней абышлося б і выгада была б большая.

Што ж тычыцца мясной жывёлагадоўлі, то гадавы план выкананы на 36 працэнтаў. Праўда, у параўнанні з мінулым годам сутачная прывага адной галавы буйной рагатай жывёлы знізілася.

Прыходзіцца здзіўляцца (і не першы раз), што жывёлу на адкорме як быццам ёсць чым карміць, а дойны статак галадае нават і вясной. Такія парадоксы сучаснага калгаснага ладу.

Мікалай ДЗЯМЧУК.

Выпала? Выбросилась?

БАРАНОВИЧИ. Из окна четвертого этажа дома по ул. Комсомольской выпала (выбросилась) женщина. В больнице ей были диагностированы множественные переломы ребер, закрытая черепно-мозговая травма и травма живота. Найти ответы на вопросы, почему и как это случилось, должно следствие.

Галина СТРОЦКАЯ.

ЧЫМ СВАЕ ГОРШЫЯ?

БЯРОЗА. Не адзін год у калгасе "Чырвоны сцяг" (вёска Міжлессе) працуюць украінцы: выбіраюць буракі, моркву. Так і ў гэтым месяцы каля 50 украінцаў прыехалі на прапалку цукровых буракоў. Хімпраполка, што рабіла сельгасхімія на Вялікдзень, ніякага выніку не дала. Немалыя грошы пайшлі ўпустую. Зелле нават не змяніла колеру, а выраслa такое, што і фрэза не бярэ.

Украінцы, як звычайна, жывуць у Доме культуры, два разы на дзень іх кормяць. Аплата за праполку: 900 кг зерня за гектар прапалотых буракоў (каля 100 тысячаў дэмінаваных рублёў па кошце зерня на базары). Усяго ў калгасе 100 га. Як кажуць вяскоўцы, за тыдзень гектар можна прапалоць. Але калі брыгадзір прывёз двух сваіх аднавяскоўцаў, якія хацелі ўзяць па гектару для праполкі (каб падзарабіць, бо заробкі ў калгасе мізэрныя), галоўны аграном забараніў гэта рабіць.

Мо, ім трэба на Украіну ехаць на заробкі?

Сяржук РУСЕЦКІ.

Ахвяры ад цыгарэты

ПРУЖАНЫ. Гэта здарылася глыбокай ноччу 21 мая ў вёсцы Купічы Крыніцкага сельсавета. Загарэўся дом, а пасля яго і хлеў. Агонь знішчыў дзве пабудовы. Але самае страшнае, што ў агні загінулі людзі: 77-гадовая жанчына і яе 43-гадовы сын.

Прычына пажару — непатушаная цыгарэта.

Мікалай КАЗЛОЎСКІ.

Пасмяёмся разам з...

прыватным прадпрымальнікам Аляксандрам Дзем'яновічам (г. Бяроза).

З выпуску тэленавін:

"Вось ужо чацвёрты дзень як невядомымі захоплены лікёра-гарэлачны завод.

Да гэтай пары тэрарысты ніяк не могуць сфармуляваць свае патрабаванні..."



Заставайцеся з "Газетай для вас"

Паважаныя падпісчыкі і чытачы "Газеты для вас"! Пачалася падпіска на наша выданне на II паўгоддзе 2000 года. У "Газеце для вас" вы заўсёды знойдзеце шматбаковую і разнастайную інфармацыю аб усім, што адбываецца ў нашым рэгіёне, рэспубліцы, свеце, аналітычныя і праблемныя матэрыялы, каментары. "Газета для вас" — гэта яшчэ і матэрыялы для дома, для сям'і, для душы, анекдоты, гараскопы, цэны на рынках рэгіёна і многае іншае...

Падпіску на "Газету для вас" вядуць усе аддзяленні сувязі Брэсцкай вобласці. **Падпісная цана: на I месяц — 239 руб, на квартал — 717 рублёў, на паўгоддзе — 1434 рублі.**

А цяпер — увага! Конкурс для работнікаў аддзяленняў сувязі і паштальёнаў!

Паважаныя работнікі сувязі! Мы добра ведаем, якая складаная і нялёгкая ў вас праца. Пралануем яе заахвоціць, а аддзяленням сувязі і паштальёнам паспаборнічаць у справе падпіскі на "Газету для вас". Тыя аддзяленні і тыя паштальёны, якія зоймуць прызавыя месцы, значна павялічыўшы колькасць нашых падпісчыкаў на III квартал г. г. у параўнанні з колькасцю падпіскі на II квартал 2000 года, атрымаюць наступныя грашовыя прэміі:

аддзяленні сувязі:
1 месца — 10000 руб.
2 месца — 7000 руб.
3 месца — 4000 руб.

паштальёны:
1 месца — 4 000 руб.
2 месца — 3000 руб.
3 месца — 2000 руб.

Няхай пашанцуе вам і нам!

Рэдакцыя "Газеты для вас".



● ПРАКТЫКУМ

Дапаможа... халадзільнік

✓ Запэцканае жавальнай гумкай адзенне выратуе толькі холад. Пакладзіце рэч у маразільную камеру халадзільніка, а праз гадзіну выміце і страсіце замёрзлую цвёрдую жавальную гумку.

✓ З дапамогай халадзільніка можна ачысціць адзенне і ад прыліплага драўнянага попелу. Калі ад яго ўсё ж застаецца след, пратрыце некалькі разоў запэцканае месца нашатырным спіртам, на 20 працэнтаў разбаўленым вадой.

✓ Замарожаныя ў ваннацы капронавыя панчохі або калготкі носяцца амаль утрая даўжэй, бо мяняецца структура валокнаў і яны не так хутка рвуцца.

✓ З дапамогай холаду можна зрабіць больш свабодным цесны абутак. Трывалы поліэтыленавы мяшэчак напоўніце вадой і пакладзіце ў чаравік. Пастаўце абутак у маразільную камеру. З 10 аб'ёмных частак вады атрымліваецца 11 частак лёду, таму чаравікі павінны расшырыцца.

● СТОП-КАДР



На вольнай прасторы...
Фотаэцюд Аляксея ГАНЧУКА.

● ВАШЕ ЗДОРОВЬЕ

ХОТИТЕ НЕ СТАРЕТЬ И НЕ БОЛЕТЬ?

"Бессмертие — это реально!" — так утверждает Б. В. Болотов, кандидат технических наук. В книге с одноименным названием он предлагает пять основных правил, соблюдая которые можно вполне реально продлить жизнедеятельность своего организма.

Правило первое (увеличение числа молодых клеток)

Человеческий организм состоит из функционирующих клеток и соединительных тканей. Клетки постоянно делятся, нарождаются и постепенно стареют. Благодаря функционированию клетки-лидера на место старых клеток заступают новые, молодые. Но с годами процент старых клеток в организме нарастает. У человека в возрасте 7—10 лет старых клеток — 10 %, а в 50 лет — уже 40—50 %.

Эффективный способ омоложения организма заключается в выведении (уничтожении, переваривании) старых клеток со сниженной функцией, место которых занимают молодые. Для этого необходимо вызвать выделение ферментов-пепсинов в желудке. С этой целью через 30 минут после приема пищи, которая уже частично подвергается перевариванию, на кончик языка помещается около одного грамма поваренной соли на несколько минут и затем, проглотив соленую слюну, нужно ополоснуть полость рта.

Оказывается, от соли рефлекторно начинает обильно выделяться желудочный сок, содержащий пепсиноподобные ферменты, которые, попадая по кровотоку во все органы, растворяют старые клетки и тем самым помогают молодым в борьбе за жизнь со старыми. Вместо соли можно после еды съесть чайную ложку морской капусты. С этой целью полезно кушать как можно больше квашеной капусты, перца, горчицы, аджики, хрена, редьки, способствующих выделению желудочного сока и в большем количестве, чем это требует переваривание пищи.

Через месяц при использовании этих рекомендаций количество молодых клеток может увеличиться на 10 %.

Второе правило (превращение шлаков в соли)

Для выведения из организма накопившихся солей и шлаков в организм необходимо вводить безопасные кислоты, т. е. принимать кислую пищу, содержащую естественные органические кислоты. С этой целью используются все виды квашений (огурцы, помидоры, капуста), а также фруктовые уксусы — яблочный, виноградный, сухие виноградные вина, пиво, лимоны. Кислоты необходимо разнообразить, так как каждому органу для выведения шлаков или превращения их в соли необходима "своя" кислота. В кислой среде лучше усваивается жирная кислота и эфирные масла.

Третье правило (выведение солей)

Есть образования, которые не выводятся кислотами, — это щелочные соли. Чтобы их вывести, необходимо применить правило — подобное растворяется подобным. Для этого нужно ввести в организм безопасные щелочи.

1) Рецепт, предложенный еще Авиценной, — это прием куриной желчи в аптечных желатиновых капсулах через 30 минут после еды.

2) Чай из корней подсолнуха растворяет даже солевые камни. Корни собирают осенью. 200 граммов промытого и высушенного корня заливают 3 литрами воды, доводят до кипения и кипятят не более 2 минут. Пить следует по одному стакану за раз и выпивать по полтора литра за день. Через две недели после начала курса начинает идти ржавая, как нефть, моча. Это выходят соли... Красные выделения идут примерно две недели, потом выделения становятся совершенно прозрачными. За это время из организма выходит около 3 килограммов солей, которые находились в суставах и сосудах.

3) Сок черной редьки действует как сильное желчегонное средство. Для этого 10 кг черной редьки вместе с кожурой пропустить через соковыжималку. Начинать нужно с чайной ложки за 30 минут до еды и доводят дозу до 0,5 стакана.

4) Хорошо употреблять настой полевого хвоща, спорыша, брусничного листа и толокнянки. Прекрасное средство для изготовления камнегонного чая — сухие арбузные корки, которые высушивают и заваривают, как чай.

(Окончание в следующем номере).

● ОН И ОНА

Как найти свою половинку?

Этот вопрос часто мы задаем себе на пороге взрослой жизни. Мучает издавна он также и исследователей человеческих судеб и душ.

Возникло множество теорий подбора идеальной пары. Карл Юнг, знаменитый швейцарский психоаналитик, ученик и друг Зигмунда Фрейда, является автором астрологического указателя подбора супруга, основанного на так называемой гармонии соотношений планет. Шкала эта появилась в прошлом веке и наверняка на нее повлияли существенные тогда, но сегодня не всегда уже актуальные моральные аспекты. Но это по-прежнему образец, многими ценимый и поддерживаемый. В нижеприведенной таблице мы увидим свои звездные соотношения. Наилучший союз — тот, у которого пятерка, хуже всего подобранный имеет ноль.

	ОВ	ТЕ	БЛ	РА	ЛЕ	ДЕ	ВЕ	СК	СТ	КО	ВО	РЫ
ОВ	5	2	0	1	5	5	5	2	4	1	4	3
ТЕ	2	5	0	5	1	5	2	3	2	5	1	5
БЛ	5	1	1	2	0	1	5	2	5	1	4	3
РА	1	1	2	4	3	5	1	4	1	4	3	5
ЛЕ	5	1	0	3	1	3	5	1	4	3	4	2
ДЕ	3	4	0	5	3	1	2	4	3	1	2	0
ВЕ	5	2	5	1	5	2	4	4	5	1	5	2
СК	2	3	2	4	1	0	1	1	2	4	1	5
СТ	4	2	5	1	4	1	5	2	5	1	5	1
КО	0	5	1	4	3	5	1	5	1	1	1	5
ВО	4	1	4	3	4	2	5	1	5	2	5	3
РЫ	3	5	1	5	0	4	2	5	1	0	3	1



Примечание

ОВ — ОВЕН (21.03—20.04), ТЕ — ТЕЛЕЦ (21.04—21.05), БЛ — БЛИЗНЕЦЫ (22.05—21.06), РА — РАК (22.06—22.07), ЛЕ — ЛЕВ (23.07—22.08), ДЕ — ДЕВА (23.08—22.09), ВЕ — ВЕСЫ (23.09—23.10), СК — СКОРПИОН (24.10—22.11), СТ — СТРЕЛЕЦ (23.11—21.12) КО — КОЗЕРОГ (22.12—20.01), ВО — ВОДОЛЕЙ (21.01—20.02), РЫ — РЫБЫ (21.02—20.03).

● ХОЗЯЙКЕ НА ЗАМЕТКУ

Просто и вкусно

Сало копченое по-деревенски. Сало от головы положить в кастрюлю, добавить вымытую луковую шелуху (чем больше, тем лучше), залить водой (на 2 л воды — 500 г соли), довести до кипения и кипятить 15 минут. Если варить больше, сало будет очень мягкое. 12 часов дать настояться в этом же рассоле. Вынуть и обсушить. Нашпиговать чесноком и приправами. Сало готово. Его можно хранить в холодильнике или подвесить сушить. Долго лежит, очень вкусное, как копченое.

Котлеты из картофеля, фаршированные яйцами. ***4 яйца, 1 кг картофеля, 100 г сливочного масла, 50 г муки или сухарей, растительное масло для жарки.***

Отварить картофель, пропустить через мясорубку, в него разбить 1 яйцо, добавить сливочное масло. Отварить 3 яйца, мелко порезать. Картофельной массе придать форму небольшой лепешки, вложить резаное яйцо, защепить котлету, обвалять в сухарях или в муке, обжарить с обеих сторон.

Подается со сметаной на завтрак или диетчикам на обед. Для украшения можно использовать зеленый лук или укроп.

"Платочки" с капустой. ***Для теста: 2 стакана муки, 2-3 ст. ложки размягченного сливочного масла или маргарина, 1 ст. ложка растительного масла, 80-100 г сметаны, немного соли.***

Смешать муку, масло, сметану и рукой вымесить тесто.

Для начинки: потушить, как обычно, капусту. Добавить лук, морковь, приправу.

Тесто разделить на 2 части, затем эти части тоже разделить на 2 и т. д., пока не будет 16 комочков. Каждый комочек раскатать на столе и сделать круглую, квадратную форму или ромбик. Положить начинку, защипнуть края и жарить на растительном масле на умеренном огне под крышкой.

Начинку из капусты можно заменить вареным мясом, рыбой, грибами и др.

Салат "Любовница". Салат состоит из трех слоев, промазанных хорошо майонезом.

Первый слой: морковь натереть на терке и смешать с изюмом.

Второй слой: сыр натереть на терке, добавить измельченный чеснок.

Третий слой: отварную свеклу натереть на терке и добавить измельченные грецкие орехи.

Верх смазать майонезом, украсить орехами и изюмом.

Почему называется так салат, вы ответите себе, когда попробуете.

"Сникерс". 1 стакан сметаны, 200 г сливочного масла и 1 стакан сахара варить до тех пор, пока эта масса не поменяет свой цвет. Затем всыпать в нее полпакета геркулеса (250 г) и держать на небольшом огне, пока овсяные хлопья не сварятся. Добавить 1—2 ст. ложки какао (можно натереть на терке шоколад). Все это непрерывно помешивать, выложить в форму и поставить в холодильник. Получается вкусный "Сникерс", который дети едят с огромным удовольствием.

● ДАЗВОЛЬЦЕ ПАДКАЗАЦЬ

Каб быць элегантнай

➢ Калі ў вас шырокія сцёгны — на жаль, прыйдзецца адмовіцца не толькі ад штаноў, але нават і ад спадніц у клетку, асабліва калі клетка вялікая. Тым болей не варта шыць сукенкі, завужаныя знізу — гэта яшчэ болей падкрэсліць вашы недахопы.

➢ Калі ў вас нізкі бюст, не варта рабіць выраз па шыі — болей падыдзе востраканечны. Не перашкодзяць і аздабленні - пяцёркі, напрыклад.

➢ Маючы вузкія плечы, не трэба рабіць шырокі каўнер альбо пінжак з шырокім адваротам.

➢ Калі вашай спіне ўжо нічога не дапаможа, і яна мае форму пытальніка, не трэба шыць сукенкі, якія абцягваюць фігуру. Сукенка будзе проста ляжаць на спіне, падкрэсліваючы сутуласць.

➢ Калі ў вас кароткая шыя, пазбягайце шырокіх капелюшоў, высокіх каўнерыкаў, выразаў на шыі, какетак, прыўзнятых "плечыкаў".

➢ Жанчынам з кароткімі рукамі не патрэбныя бранзалеты, ажурныя пальчаткі, рукавы з манжэтамі. Калі плечы шырокія, а рукі ля плячэй выглядаюць занадта важнымі, не трэба рабіць вузкую пройму. Жанчынам з доўгімі рукамі, наадварот, лепей пазбягаць доўгіх і прамых рукавоў.

● ШТО ХВАЛЮЕ

АДДАЙЦЕ ЗАРПЛАТУ!

Яе, маленькую, скубуць інфляцыя і цэны

Тое, што ў нас маленькая зарплата, агульнавядома. Але ж яе яшчэ даволі цяжка своечасова атрымаць.

Як снежны камяк расце ў краіне запазычанасць па заработнай плаце. Калі на 31 студзеня 2000 года яна складала 7020,4 мільёна рублёў, на 31 сакавіка — 10121,7 дык па стане на 29 красавіка ўжо пераваліла за 12,7 мільярда рублёў. Запазычанасць па заработнай плаце ў працэнтах да месячнага фонду ў снежні складала 3,8 %, у студзені — 7,1 %, у сакавіку — 9 %, па стане на канец красавіка — 10,1%.

А ў краіне ж інфляцыя. Не атрымаў своечасова грошы, лічы, добрую частку іх ужо згубіў. Бо цэны ж растуць амаль штодня.

Цікавасць выклікаюць данныя па запазычанасці па зарплаце па абласцях і галінах эканомікі. Так, у Мінску ў асноўным зарплата выдаецца ў тэрмін. Тут яе запазычанасць складае ўсяго 0,8 % месячнага фонду. А вось у Магілёўскай вобласці гэты паказчык раўняецца 13,4 %, у Гродзенскай вобласці — 14,4 %, Брэсцкай вобласці — 14,8%. Словам, чым далей ад сталіцы, тым горш з выдачай заробленых грошай.

Тактыка ўлад тут лёгка праглядваецца. Не дай грошай мінчанам, дык яны могуць выйсці на мітынг і запатрабаваць іх. А гэта ж стане вядома і ў Расіі, і ва ўсім свеце, што можа моцна падарваць байкі аб добрым жыцці ў Беларусі.

Калі ж паглядзець на запазычанасць па галінах эканомікі, дык нельга не ўбачыць нейкую наўвязку. У работнікаў прамысловасці яна маленькая, усяго 3,6 % ад месячнага фонду зарплаты. А вось у сельскагаспадарчай вытворчасці — аж 67,7 %, у тым ліку ў калгасах — 83,4 %. Як бачым, калгаснікі амаль што не атрымліваюць свае мізэрныя заробкі ў тэрмін. А яны ж, бадай, самы надзейны электарат прэзідэнта. Як жа так, сваім ды так кепска плаціць?

Але і тут ёсць свая логіка. Паспрабуй не даць грошы рабочым буйных заводаў, дык яны могуць аб'явіць страйк ці правесці мітынг. Зноў жа, пагалоска па свеце. А калгаснікі будуць цярпець. Так што ім можна і не плаціць у тэрмін. Вось такія думкі вынікаюць з даных па запазычанасці па зарплаце.

Яўген ТАЎГЕНЬ.

XXX

Такое ж становішча з выплатай заработнай платы ў нашым рэгіёне, гэта значыць, у Івацэвіцкім, Баранавіцкім, Бярозаўскім і Пружанскім раёне.

Мізэрную зарплату са спазненнем атрымліваюць культработнікі, настаўнікі, медыкі...

Не гаворачы ўжо пра калгаснікаў, якія па тры, чатыры і больш месяцаў не бачаць сваіх невысокіх заробкаў. Словам, чым далей ад сталіцы, тым горш выплачваюць заробленыя грошы.

Напрыклад, на мясакамбінаце, "Цеплапрыборы" г. Бяроза зарплату пачалі затрымліваць пастаянна. У Івацэвіцкім лесапрамгасе таксама не радуюць сваіх рабочых і служачых. А работнікі Целяханскага ўчастка не першы раз тэлефануюць і пішуць у розныя інстанцыі, каб дапамаглі атрымаць заробленыя грошы.

Некаторым працоўным калектывам нават пра мізэрную зарплату прыходзіцца марыць. Так, Івацэвіцкі завод ЖБВ, калі цэмент ёсць, то працуе. Калі яго няма — прастойвае. Таму і не дзіўна, што гэтым прадпрыемствам за чатыры месяцы сёлетняга года выпушчана толькі 62,6 працэнта прадукцыі да яе колькасці за такі ж перыяд летась.

Святаслаў РЫГОРАЎ.

● ТАЛЕНТЫ СЯРОД НАС

Падведзены вынікі краязнаўчага конкурсу "Берасцейшчына-2000",

што праводзіўся краязнаўчым бюлетэнем-дайджэстам "Гістарычная брама" пры падтрымцы абласнога цэнтра "Вежа" ў лютым—маі бягучага года для моладзі 12—25 гадоў. 1-е месца заняў краязнаўчы гурток Чучавіцкай СШ Лунінецкага раёна, 2-е — Алена Пытлякова з Берасця, а чатыры трэція месцы падзялілі Іра Драчэнка з Белаазёрска, Света Петручэня з в. Першамайскай Бярозаўскага раёна, Каця Ліцкевіч з в. Новая Мыш Баранавіцкага раёна і Таня Вярбіцкая з в. Новыя Пескі Бярозаўскага раёна. Творы конкурсантаў надрукаваны ў здвоеным нумары бюлетэня. Пераможцы, а таксама і ўсе ўдзельнікі конкурсу адзначаны прызамі, а летам гэтага года ў іх будзе магчымасць прыняць удзел у археалагічным летніку.

Сяржук РУСЕЦКІ.


● КОНКУРСЫ

"САМАЯ ОБАЯТЕЛЬНАЯ И ПРИВЛЕКАТЕЛЬНАЯ"



СВЕТЛАНА, по гороскопу — Козерог. Общительная, увлекаюсь современной музыкой, по возможности занимаюсь спортом. Любимая группа — "Демо".
В парнях ценю и уважаю ум, силу, общительность.

"СЯБРЫ ГАРМОНІІ І ШТАНГІ"



СЯРГЕЙ, па гараскопу — Леў. Люблю і з задавальненнем слухаю тэхнамузыку. Рэгулярна займаюся цяжкай атлетыкай. Зайздрошчу і стараюся быць падобным на знакамітага баксёра Ленакса Льюіса. Падабаюцца высокія, стройныя, з выразнымі вачыма дзяўчаты.

● ЭКОНОМИКА

МЕЧТА ПРЕКРАСНАЯ, ПОКА НЕЯСНАЯ...

Повышению минимальной заработной платы с 1 мая на 18 процентов предшествовала острая борьба. С учетом роста инфляции профсоюзы в переговорах с правительством настаивали, чтобы минимальная плата была повышена почти вдвое - до 4 тысяч рублей, соответственно - ставка первого разряда и заработная плата всех уровней. Напротив, представители правительства придерживались мнения о невозможности такого шага. Они выполняли твердый наказ А.Лукашенко, данный в середине апреля премьер-министру Владимиру Ермошину: повысить заработную плату с 1 мая в границах возможного.

Первым об этих "границах" заявил министр экономики Владимир Шимов 26 апреля в своем выступлении перед членами пропрезидентского парламента. И назвал конкретные цифры предстоящего повышения минимальной заработной платы: с 2200 до 2600 рублей.

Причины такого скромного, почти условного, повышения зарплаты бюджетникам объяснил министр финансов Михаил Корбут, выступивший перед депутатами палаты в тот же день. Он заявил, что на сегодня существуют "серьезные сложности с наполнением казны. На конец апреля доходная часть республиканского бюджета выполнена только на 16 процентов". Такой недобор денежных ресурсов министр оправдал значительным отставанием поступления доходов от акцизных товаров (спиртных и табачных изделий), резким ростом цен на зерно, уменьшением российских поставок нефтепродуктов.

Как бы там ни было, по причине ограниченности денежных ресурсов провели не повышение заработной платы, а лишь ее компенсацию. Да и то частичную, потому что только за первый квартал нынешнего года цены на потребительские товары взлетели на 31 процент и продолжали расти в апреле.

Очередное повышение "минималки" не решает ни одной кардинальной проблемы в сфере заработной платы. О ее реформе уже несколько лет идут только разговоры. Достаточно привести несколько фактов, чтобы убедиться: проблемы по-прежнему остаются нерешенными.

Так, на сегодня начисленная заработная плата, т.е. номинальная, значительно ниже минимального потребительского бюджета (35 000 рублей) для многих категорий работников. В частности, для работников сельского хозяйства, социального обеспечения, культуры, искусства, здравоохранения, образования, торговли и общественного питания, физкультуры и спорта. Как могут нормально трудиться работники колхозов и совхозов, если их среднемесячная заработная плата (в пределах 22 тысяч рублей) составляет только 60 процентов минимального потребительского бюджета. А ведь во многих хозяйствах она в полтора-два раза ниже. Не сказать, чтобы зарплата была высокой в промышленности и строительстве, но здесь она все же выше соответственно в 2,5 и 2 раза в сравнении с уровнем оплаты труда в сельском хозяйстве.

Только в банковской системе зарплата выглядит высокой относительно других сфер трудовой деятельности - свыше 80 тыс. рублей в месяц. Вместе с тем, здесь происходит снижение заработков, что нельзя считать оправданным по многим причинам, ибо разрыв между оплатой труда различных категорий работников в нынешних условиях должен преодолеваться не за счет снижения оплаты труда высокооплачиваемых работников (предполагается, что они и высокопрофессиональные), а за счет повышения заработной платы низкооплачиваемых категорий.

Ситуация в сфере распределительных отношений обострена еще и тем, что правительству не удается ликвидировать задолженность по заработной плате. И сегодня она находится на очень высоком уровне - свыше 12 миллиардов рублей. Причем эта задолженность накопленная, ибо свыше 75 процентов ее приходится на февраль, 23 - на январь, а 1,5 процента - и вовсе на 1999 год.

Неблагополучно и в других секторах распределительных отношений, т.е. в сфере трансфертов. Как сообщила министр социальной защиты Ольга Даргель, в связи с улучшением с 1 мая пенсионного обеспечения инвалидов и участников Великой Отечественной войны и некоторых других категорий граждан в мае для выплаты пенсий необходимо собрать 68 миллиардов рублей. Для этого имеется резерв социального фонда на 15-17 дней. Между тем стабильность выплаты пенсий может быть обеспечена при запасе социального фонда на 6 месяцев, чего никак не предвидится.

Вызывает тревогу то обстоятельство, что, по оценке Ольги Даргель, с каждым месяцем в стране нарастает просроченная задолженность по страховым отчислениям. На начало мая она достигла 5,5 млрд. рублей. По причине финансовых трудностей колхозы и совхозы практически прекратили отчисления в фонд социальной защиты. Между тем как раз на селе проживает значительная часть пенсионеров. Фактически их содержание перекладывается на плечи работников промышленности. И это при условии, что в стране на каждых 160 работающих граждан приходится 100 пенсионеров.

Напряженное положение и с выплатой помощи семьям, воспитывающим детей. В Министерство социальной защиты поступает много письменных и устных заявлений о задержках выплат государственной помощи на детей. И эти задержки не случайны. Не выплачивается заработная плата, не начисляется социальный фонд и не выплачиваются деньги на содержание детей. Что в этих условиях советует заместитель начальника управления социального страхования Фонда социальной защиты населения Лариса Копыльская? Обращаться в Фонд социальной защиты. Для этого нужно заполнить специальное заявление и пройти процедуру проверки районными отделениями фонда. Нетрудно представить, какая это волокита и как тяжело семьям, воспитывающим детей, которым нужна пища каждый день, а не когда-нибудь потом. Тем временем продолжается рост цен на продовольствие и товары широкого потребления, а также тарифов на транспортные услуги.

Словом, сегодня все говорит о том, что давно назрела реформа не просто заработной платы, а всей системы распределительных отношений. И теперь положение не спасти ни приостановкой строительства ледовых дворцов, ни отказом от части затрат на помпезные мероприятия типа военного парада 9 мая.

Конечно, в бедной стране эта роскошь просто непозволительна. Но кроме этого, надо наконец резко сократить затраты на силовые структуры, на содержание раздутого государственного аппарата, на финансирование безнадежных форм хозяйствования. И все это должно быть осуществлено на фоне реформирования народного хозяйства в целом. Только при этом условии можно, наконец, уйти от популистских разговоров о повышении реальной заработной платы.

Владимир КУЛАЖЕНКО,
доктор экономических наук,
профессор, БелаПАН.

ЁСЦЬ НА ПАЛЕССІ КАНАЛ...



"Дрэмле памятка дзён, што ў нябыт уцяклі... Гэта памяць людская..." Так пісаў народны паэт Беларусі Янка Купала. Пісаў пра нашу сівую мінуўшчыну, пра нашу Бацькаўшчыну, гісторыя якой так багата на самыя розныя падзеі. Ваенныя, культурныя, сацыяльныя... Пра іх сёння мы зусім мала ведаем. Узяць бы хаця Агінскі канал, што быў у свой час гордасцю Палесся. Ён звязваў між сабой Балтыйскае і Чорнае моры. Па ім хадзілі пасажырскія параходы і баржы, а плытамі сплаўлялі па ім лес.

І днём, і ноччу кіпела праца на канале. Амаль паўтара стагоддзя канал жыў, дзейнічаў, прыносіў немалыя грашовыя выдаткі спярша Рэчы Паспалітай, затым Расіі, потым зноў Польшчы.

У час першай сусветнай вайны канал быў разбураны, пры польскай уладзе яго аднавілі. Водная артэрыя дзейнічала да пачатку Вялікай Айчыннай вайны, калі зусім была пашкоджана і перастала эксплуатавацца.

У гэтых нататках пастаўлена адна мэта: сабраць у адно цэлае вядомыя і невядомыя звесткі пра спонсараў канала, яго будаўніцтва і будаўнікоў, эксплуатацыю, пра падзеі, якія адбываліся вакол гэтай воднай сістэмы, пра сённяшні стан канала і, вядома, пра думкі і меркаванні самых розных людзей.

Гісторыя ёсць гісторыя. Як сказаў адзін з вядомых людзей, нельга рухацца наперад, не ведаючы мінулага роднага краю, свайго народа, усёй Бацькаўшчыны. Што ж, паспрабуем зазірнуць у мінулае і ў заўтрашні дзень, а таксама ўбачыць і ацаніць сённяшні стан Агінскага канала — гістарычнай будоўлі XVIII стагоддзя.

I. АГІНСКІЯ. ХТО ЯНЫ?

1.

Пры назве прозвішча Агінскі я адразу ўспамінаю чароўную мелодыю, якая ахоплівае душу, заварожвае. Здаецца, слухаў бы яе і слухаў. Гэта ўсім вядомы паланез "Развітанне з Радзімай", які стварыў Міхаіл Клеафас Агінскі. Вялікі кампазітар, вядомы чалавек, сапраўдны патрыёт сваёй Бацькаўшчыны.

Агінскія. Хто ж яны?

Сапраўды, Агінскія, а не адзін Міхаіл Клеафас. Гэта старадаўні магнацкі род, які нават меў свой родавы герб "Агінец". Прадстаўнікі гэтага роду адыгрывалі значную ролю ў дзяржаўным, грамадскім, палітычным і культурным жыцці Беларусі, Літвы, Польшчы і Расіі. Ім належалі маёнткі ў Залессі, Маладзечне, Слоніме, Бялынічах, Целяханах, Лагішыне, Пінску і ў іншых месцах Беларусі.

Як сцвярджаюць некаторыя даследчыкі, сваё паходжанне Агінскія бяруць ад Рурыкавічаў (казельская галіна чарнігаўскіх князёў).

Але ёсць другая версія, якая, па ўсім відаць, бліжэй да ісціны. Роданачальнікам Агінскіх з'яўляецца смаленскі князь Іван Васільевіч Глушонак. Дарэчы, у пачатку 1480 года ён перайшоў да Івана III, вялікага князя маскоўскага.

А вось Дзмітрый і Іван, сыны Глушонка, засталіся ў Вялікім княстве Літоўскім і заснавалі роды Агінскіх і Пузынаў.

Так, Дзмітрый упершыню ўпамінаецца ў 1486 годзе (памёр у пачатку 16 стагоддзя). Ён атрымаў ад вялікага князя літоўскага Аляксандра маёнтак Агінты (каля Коўна). Багдан, сын Дзмітрыя Глушонка (памёр у 1542 годзе) у 1510 годзе атрымаў пацверджанне правоў на Агінты. Зусім верагодна, што ён першы



Міхаіл Клеафас Агінскі.

пачаў ужываць прозвішча Агінскі. У завяшчанні 1555 года яго ўдава названа гэтым прозвішчам.

Мацвей і Фёдар, сыны Багдана, упершыню згадваюцца ў дакументах у 1547 годзе як князі Агінскія з дадаткам да прозвішча — "з Казельска".

У дзяржаўных архівах Вялікага княства Літоўскага Агінскія называюцца з 1547 года, а ў метрыцы каронная — з 1628 года.

2.

У XVII стагоддзі род Агінскіх падзяліўся на дзве галіны — старэйшую, якая ў XVII-м — пачатку XIX стагоддзя мела графскі тытул, і малодшую — браслаўскую, якая страціла княжацкі тытул і належала да шляхты, а пазней — да дваранства.

Дарэчы, княжацкі тытул старэйшай лініі пацверджаны ў Польшчы ў 1821 годзе, а ў Расіі — у 1868 годзе.

Князі Агінскія ў XIX стагоддзі мелі маёнткі ў Віленскай губерні, а дваране Агінскія — у Віцебскай. Усе яны былі праваслаўнага веравызнання, а ў XVII стагоддзі прынялі каталіцтва.

Найбольш вядомыя Агінскія: Багдан, Аляксандр, Самуэль, Шыман Караль, Марцыян, Ян, Рыгор Антоні, Ігнацы, Міхаіл Казімір, Андрэй і Міхаіл Клеафас.

Пра кожнага з іх можна расказаць шмат цікавага. Усе яны былі ў той час па-свойму таленавітыя і вядомыя людзі, займалі высокія пасады.

Напрыклад, Багдан быў ротмістрам гусарскім, палкоўнікам войска Вялікага княства Літоўскага, удзельнічаў у Лівонскай вайне ў 1558—1582 гадах, у падаўленні паўстання Налівайкі (1596 г.), у шведска-польскай вайне 1601—1602 гадах. Пяць разоў прымаў удзел у мірных перагаворах з Расіяй.

Ваяводам мсціслаўскім быў Шыман Караль. Валодаў Еўем і Лёзнам. Атрымаў спадчыну ад стрыечнага брата. У 1660 годзе служыў паручнікам у войску Вялікага княства Літоўскага, ваяваў супраць рускага цара. Меў шэсць сыноў і дзве дачкі.

Рыгор Антоні з'яўляўся маршалкам трыбунала літоўскага (1706 г.). Удзельнічаў у шэрагу войнаў. У 1700 годзе сваімі войскамі разграміў атрады шляхты пад Альпенікамі. У час паўночнай вайны ваяваў супраць шведскіх войскаў і атрадаў С. Ляшчынскага. Атрымаў некалькі перамог над шведскімі полчышчамі. Прыхільнік саюза з Расіяй.

3.

Але нашых чытачоў, мне думаецца, больш цікавяць тыя Агінскія, жыццё і дзейнасць якіх звязана нейкім чынам з Агінскім каналам ці з падзеямі вакол яго, з нашай мясцовасцю.

У ліку іх магнат Міхаіл Казімір Агінскі і яго пляменнік Міхаіл Клеафас Агінскі. Першы быў спонсарам канала, другі — вядомым кампазітарам. Іх жыццё было насычана самымі рознымі падзеямі. На асобных з іх варта спыніцца па той прычыне, што яны з'яўляюцца пэўнай характарыстыкай той эпохі, калі яны жылі і дзейнічалі.

Міхаіл Казімір Агінскі (1730—1800) — гетман Вялікага княства Літоўскага, вядомы мецэнат, кампазітар, мастак, паэт. Ён з'яўляецца прадстаўніком магнацкага роду. Яго бацька, Тадэвуш Юзаф, быў ваяводам трокскім, маці Ганна — з роду магнатаў Вішнявецкіх. Нарадзіўся Казімір у Казельску. У дзяцінстве выхоўваўся разам з шасцю сваімі сёстрамі. Бацьку, прыхільніка саксонскіх каралёў, ён страціў рана. Пасля гэтага яго бабуля Элеанора, жонка Віленскага ваяводы, наклала на ўсю маёмасць часовы арышт. З таго часу Агінскі знаходзіцца спачатку пад апякунствам свайго дзеда па матчынай лініі, гетмана Вішнявецкага, а пасля яго смерці (1744 г.) пад наглядам Марцыяна Агінскага, віцебскага ваяводы.

Пра выхаванне Міхаіла Казіміра вядома мала. Без сумнення, з дзяцінства ён вывучаў музыку і выяўленчае мастацтва. У маладым узросце паявіўся на арэне грамадскага жыцця. У чэрвені 1748 года быў прызначаны польным літоўскім пісарам, а праз тры месяцы атрымаў званне генерал-маёра.

Восем гадоў (1753—1761 гг.) Агінскі падарожнічаў па Еўропе, быў у Вене, Дрэздэне, Парыжы.

4.

18 кастрычніка 1761 года Міхаіл Казімір ажаніўся на ўдаве, трэцяй жонцы Міхаіла Антона Сапегі. Гэты шлюб, заключаны нібы па каханні, не быў шчаслівым. Бяздзетныя Агінскія жылі пераважна паасобку, кожны сваім уласным жыццём, сустракаліся рэдка. У выніку гэтага шлюбу Агінскі атрымаў Слонімскую эканомію. Менавіта яго стараннямі заштатны Слонім быў ператвораны ў "палескія Афіны".

Як ваенны, Агінскі ўдзельнічаў у вайне супраць рускіх. Трохтысячны атрад Агінскага разбіў Сувораў пад в. Сталовічы (цяпер Баранавіцкі раён).

"Усё я страціў: грошы, рэчы, паперы, — паведамляў гетман, — але ніколі не страчу стойкасці, мужнасці і імкнення да абароны краіны".

У выніку Міхаіл Казімір быў вымушаны часова эміграваць за мяжу.



Міхаіл Казімір Агінскі.

М. К. Агінскі быў добра адукаваным і таленавітым чалавекам. Ён пісаў вершы, аповесці, маляваў, сачыняў музычныя творы, іграў на кларнеце, скрыпцы, арфе і клавікордах. Пры сваім двары ў Слоніме стварыў вядомы па тым часе оперны тэатр, капэлу і аркестр. Для падрыхтоўкі балетных артыстаў і музыкантаў з прыгонных арганізаваў школу.

Аркестравы ансамбль быў створаны таксама ў Целяханах. Пра яго вядома нямнога. Заснаваны быў у 1795 годзе ў Целяханскім маёнтку Агінскага і існаваў да смерці гетмана. Акрамя фінансавых спраў, якія хвалявалі Міхаіла Казіміра, гэты ансамбль, як сцвярджаюць, быў той прыцягальнай сілай, якая вабіла хворага Агінскага ў апошнія гады яго жыцця ў Беларусь.

Велічыня і сам склад ансамбля, на жаль, застаюцца невядомымі. Толькі прозвішчы двух музыкантаў дайшлі да нас. Гэта Міхаіл Бляўскі і А. Баброўскі. Засталося і ўпамінанне пра тое, што куплены струны ці труба. Целяханскі ансамбль знаходзіўся пад апекай палкоўніка Ляхніцкага. Ён атрымаў гэтую пасаду яшчэ ў Слоніме ў 1792 годзе. Аднак мясцовым ансамблем Ляхніцкі цікавіўся вельмі мала.



Радавы герб Агінскіх.

5.

Агінская лічаць аўтарам выдадзеных у Варшаве пад псеўданімам "Слонімскі грамадзянін" перадавых для свайго часу зборнікаў "Гістарычныя і маральныя аповесці" (1782 г.), "Байкі і небайкі" (1788 г.). У апошні зборнік увайшлі вершы з "Песень пана Міхаіла графа Агінскага, гетмана Вялікага княства Літоўскага, укладзеныя ў верасні 1770 г. у Слоніме".

М. К. Агінскі вядомы і як оперны кампазітар. Ён — аўтар пастаўленых на сцэне яго опер "Зменены філосаф" (1771 г.), "Елісейскія палі" (1788 г.), а таксама "Сілы свету", "Становішча саслоўяў" (1784 г.).

Агінскі пісаў таксама скрыпічныя п'есы. У 1778 годзе адкрыў для сваіх прыгонных "Дэпартамент балетных дзяцей", дзе, акрамя танцаў, дзяцей вучылі чытанню і пісьму.

Апошнія гады жыцця М. К. Агінскі правёў у Варшаве.

6 ліпеня 1794 года Агінскі фактычна склаў з сябе гетманскія паўнамоцтвы на карысць пляменніка Міхаіла Клеафаса.

6.

Міхаіл Клеафас Агінскі (1765—1833), як сказана вышэй, пляменнік гетмана Міхаіла Казіміра Агінскага, нарадзіўся ў Гузаве, недалёка ад Варшавы. Ён таксама прадстаўнік старадаўняга магнацкага роду. Яго бацька Андрэй быў ваяводам трокскім, а маці Паўла — з роду магнатаў Шэмбекаў.

Клеафас атрымаў добрую дамашнюю адукацыю, меў выдатныя здольнасці да музыкі і замежных моў. Вядомы як дыпламат, кампазітар, вялікі падскарбі літоўскі.

У 1794 годзе ўдзельнічаў у паўстанні пад кіраўніцтвам А. Т. Касцюшкі, уваходзіў у Найвышэйшую раду літоўскага народа. Агінскі ахвяраваў на патрэбы паўстання 188 тысяч злотых. На свае сродкі арганізаваў атрад і кіраваў 480 стральцамі. Называў сябе "Салдатам рэвалюцыі". Агінскі са сваімі стральцамі рабіў адчайныя рэйды ў ваколіцах Ашмян, Смаргоні, Івянца, Валожына. Сярод паўстанцаў пра Клефаса хадзілі сапраўдныя легенды.

"Я стварыў марш для майго атрада стралкоў са словамі, напісанымі да гэтай музыкі, — пісаў пазней Агінскі, — і з таго часу гэты марш выконваецца ў многіх палках. Я напісаў таксама ваенныя і патрыятычныя песні, якія карыстаюцца вялікім поспехам, паколькі ўзбуджалі храбрасць, энергію і энтузіязм маіх таварышаў па зброі".

Паўстанне пацярпела паражэнне, і Міхаіл Клеафас Агінскі, эміграваўшы за мяжу, восем доўгіх гадоў правёў у далечыні ад радзімы. Аднак ні Канстанцінопаль, ні Венецыя, ні Парыж не маглі засланіць сабою ягонай тугі і смутку па сваёй Бацькаўшчыне.

Святаслаў **КАЖАДУБ.**

(Працяг будзе).

"ДЗЯДЗЕЧКА, НЕ СТРАЛЯЙ!"

Такія былі апошнія словы семнаццацігадовага хлопца Дзмітрыя Дразда, жыхара г. Баранавічы, які 13 верасня мінулага года забраўся, пералезшы цераз бетонную агароджу і пралачную загароду, на тэрыторыю паста в/ч 55435 з мэтай знайсці кавалак трубы для матацыкла на звалцы.

На дзеянні хлопца адрэагаваў часавы — стралок ваенізаванай аховы Мікалай Янушкевіч. Ён паведаміў аб гэтым у каравульнае памяшканне і застаўся чакаць далейшых дзеянняў парушальніка.

Праз 10 хвілін непадалёку ад ахоўніка з'явіўся Дзмітрый Дрозд, які бегам вяртаўся назад. У руках хлопца, дарэчы, нічога не было. Часавы ўскрыкнуў: "Стой! Страляць буду!"

Пасля вокрыку часавога Дзмітрый стаў бегчы марудней.

Часавы зрабіў папераджальны выстрал уверх — Дзіма працягваў бегчы і крычаў: "Дзядзечка, не страляй!" Наступныя два выстралы "дзядзечка" ўжо рабіў на паражэнне. Другая куля аказалася ракавой для Дзімы. Куды заляцела першае куля мы раскажам трошкі пазней.

Адразу пасля трагічнага здарэння Баранавіцкая міжгарнізонная пракуратура ўзбудзіла крымінальную справу па факту нападзення на часавога-стралка в/ч 55435 Мікалая Янушкевіча няўстаноўленым хлопцам і спыніла ў сувязі з адсутнасцю ў дзеяннях апошняга састава злачынства. Такім чынам, пракуратура канстатавала, што часавы дзейнічаў згодна са Статутам каравульнай і паставой службы і яго дзеянні адэкватныя і правільныя.



Між тым, трэба адзначыць важны момант усёй гэтай справы, на якой завастрыла ўвагу маці, сваякі загінуўшага: па знешняму перыметру вайсковай часці папераджальных таблічак кшталту "СТОЙ!", "ЗАБАРОНЕНАЯ ЗОНА", "СТРАЛЯЮЦЬ!" не было размешчана, таму летам мясцовыя жыхары ходзяць сюды па ягады, паміж першай і другой агароджамі ходзяць нават каровы.

У сувязі з гэтым маці Дзмітрыя, Таццяна Дрозд, звярнулася ў Баранавіцкі гарадскі суд з іскавай заявай аб пакрыцці матэрыяльных і маральнай страты у сувязі са смерцю сына. Страты Таццяна Сямёнаўна пералічыла наступныя:

а) аплата матэрыяльных расходаў (аплата аўтатранспарту, паслуг свяшчэнніка, за вянкі, за труну, адзенне для нябожчыка, жалобны абед, помнік) у суме 662900 руб.;

б) кампенсацыя за нанесены маральны ўрон на суму 900000 рублёў.

Разгляд справы адбыўся 17—18 мая ў Баранавіцкім гарадскім судзе.

Адразу адзначым, што суддзя Васіль Петрыў, які вёў гэтую справу, "прыўнёс у разгляд яе, скажам так, чалавечы момант, таму сваякі загінуўшага не выглядалі на судзе ізгоямі ці папрашайкамі. Тым больш, што "правільныя" дзеянні часавога ваенізаванай аховы выклікаюць па меншай меры здзіўленне. Асабліва калі пазнаёміцца з Мікалаем Янушкевічам як з асобай.

Часавы Мікалай Янушкевіч — ваенны пенсіянер, які да гэтага... 22 гады адслужыў у арміі прапаршчыкам і мог у гэткай нестандартнай сітуацыі праявіць сябе, так бы мовіць, "не мальчиком, но мужем". Тым больш, што Дзіма вяртаўся з пустымі рукамі, ніякіх каштоўнасцяў не выносіў. Як заўважыў пасля судовага паседжання грамадскі абаронца Сяргей Гоўша, гэты выпадак толькі пацвердзіў тыя ўмоўна-карыкатурныя адносіны нашых суграмадзян да прафесіі прапаршчыка. Гэты выпадак падобныя адносіны, як ні сумна, толькі ўзмацняе.

Першы стрэл, які зрабіў часавы на паражэнне, мог прынесці не меншую трагедыю. Справа ў тым, што жылыя дамы ўскраіны г. Баранавічы падыходзяць ушчыльную да тэрыторыі паста, таму любая страляніна тут можа прынесці бяду. У нашым жа выпадку першая выпушчаная часавым куля ледзь не трапіла ў хлопцаў, сяброў Дзімы, якія кампаніяй сядзелі непадалёку (чакалі сябра), яна прасвістала над іх галовамі. Думаецца, яшчэ добра, што былы таварыш прапаршчык, які, відаць, хацеў добра выслужыцца, зрабіў адзіночныя стрэлы, а не выпусціў чаргу-другую.

Баранавіцкі гарадскі суд уважліва прааналізаваў тое, у якой меры пост в/ч 55435 абсталяваны адпаведна са Статутам каравульнай і паставой службы. Высветлілася, што сапраўды па ўсяму знешняму перыметру часці не вывешана ніякіх папераджальных таблічак, кшталту "СТОЙ!", "СТРАЛЯЮЦЬ", "ЗАБАРОНЕНАЯ ЗОНА", вышыня бетоннай агароджы ніжэй за патрабуемую Статутам, стан калючага дроту яшчэ менш адпавядае патрабаванням. Такім чынам, суд выраšыў, што менавіта неадпаведнасць патрабаванням Статута і спрыяла стварэнню сітуацыі, пры якой стала магчыма трагедыя.

Праўда, суд некалькі перагледзеў сумы іску. Так было прынята да ўвагі тое, што кошт жалобнага абеда павышаны ў сувязі з тым, што на 105 чалавек (колькасць гасцей жалобнага абеда) не магло быць скарыстана больш 30 бутэлек гарэлкі (па праваслаўнаму звычаю, маўляў, на такой цырымоніі больш трох чарак не выпіваюць). Перагледзеў суд у бок змяншэння і кошт гранітнага помніка.

Такім чынам, суд вынес пастанову — спагнаць з вайсковай часці 55435 на карысць Таццяны Дрозд, жыхаркі г. Баранавічы, 1 мільён 170 тысяч (1 мільярд 170 мільёнаў) рублёў.

Вядома, ніякія грошы не кампенсуюць маці страту сына, які прыняў смерць не столькі з-за ўласнай лёгкадумнасці, колькі з-за злачыннай лёгкадумнасці і гаспадарча-звычайнай расхлябанасці вайсковай часці...

Аляксандр ГОРБАЧ.
г. Баранавічы.

Эх вы, коні...

БЯРОЗА. З добрымі намерамі стваралася коннаспартыўная школа на базе саўгаса "Прамень". Арганізатар і спонсар яе — ГПП "Бярозабудматэрыялы" — меркаваў разгарнуць вялікую спартыўную работу, навучыць дзяцей верхавой яздзе і догляду за жывёлай. Ад вясковых падлеткаў, здавалася, не будзе адбою.

Планы (хай самыя прывабныя) застануцца планамі, калі справу пусціць на самацёк. Менавіта так атрымалася ў дадзеным выпадку. Праз некаторы час коні засталіся без фуражу, догляду і нагляду. Хто хацеў, той браў іх і абрабляў соткі. Юныя наезнікі таксама бралі коней "напракат" і гарцавалі на іх амаль па ўсяму раёну.

Сталася так, што не было чым карміць жывёлу. Самыя спагадлівыя дзеці прыносілі коням хлеб, буракі, сена.

Канюшня паступова ператваралася ў прытулак для "цяжкіх" падлеткаў. Набраўшы спіртных напояў і харчоў, яны хаваліся тут ад бацькоў і школы. Не аднойчы міліцыя адлоўлівала тут непаслухмяных і вяртала іх у сем'і.

Ніякага ўліку пагалоўя жывёлы не было. Гэта прыяло да таго, што бясследна зніклі двое коней.

